# Палажэнне аб прынцыпах інфармацыйнага супрацоўніцтва паміж сайтам Беларускай Нацыянальнай платформы ФГС УП і інфармацыйнымі рэсурсамі арганізацый- удзельнікаў

Прынята за аснову Канферэнцыяй БНП 4 лістапада 2013 года

### *Задачы дадзенага дакумента:*

Сайт Беларускай Нацыянальнай платформы (www.npbelarus.info) створаны ў мэтах павышэння інтэнсіўнасці камунікацыі паміж арганізацыямі, якія ўваходзяць у БНП і шырокага інфармавання беларускай і міжнароднай грамадскасці аб працэсах, якія адбываюцца ў грамадзянскай супольнасці Беларусі і ў рамках праграмы Усходняга партнёрства, а таксама ў рамках сумежных праграм і ініцыятыў. Дасягненне гэтых мэтаў магчыма толькі намаганнямі шырокага кола зацікаўленых арганізацый.

Задача развіцця сайта ў актуальны перыяд (2013-2014) - стварэнне на базе сайта БНП максімальна поўнай карціны дзейнасці БНП і арганізацый-удзельнікаў, а таксама прадстаўлення рамачных працэсаў ФГС і УП. Дадзенае «Палажэнне аб прынцыпах інфармацыйнага супрацоўніцтва» прапануецца ў якасці інструмента для выканання гэтых задач.

### *Магчымасці супрацоўніцтва арганізацый- удзельнікаў БНП з сайтам платформы*

У бліжэйшы час на сайце БНП будзе размешчана кантактная інфармацыя і кароткае апісанне дзейнасці ўсіх арганізацый-удзельнікаў БНП для забеспячэння іх бачнасці і магчымасці для міжнародных партнёраў увайсці ў кантакт з цікавымі для іх арганізацыямі грамадзянскай супольнасці.

Сайт БНП ўтрымлівае таксама дзве дынамічныя рубрыкі - «Навіны» і «Анонсы» - напаўненне якіх будзе залежыць ад актыўнасці арганізацый-удзельнікаў БНП. Адпаведна, арганізацыі, якія з'яўляюцца сталымі ўдзельнікамі Беларускай Нацыянальнай платформы, могуць дасылаць свае матэрыялы для размяшчэння ў гэтых рубрыках.

### *Змястоўныя крытэрыі , якім павінны адказваць інфармацыйныя матэрыялы , дасланыя для размяшчэння на сайце БНП :*

1 . Фокус на Усходнім партнёрстве і Еўрапейскім дыялогу аб мадэрнізацыі

Матэрыялы для змяшчэння на сайце БМП павінны прыярытэтным чынам тычыцца пытанняў і парадку дня Усходняга партнёрства і Еўрапейскага дыялогу аб мадэрнізацыі з беларускім грамадствам - двух прыярытэтных ініцыятыў у рамках беларуска-еўрапейскіх адносін. Таксама актуальнымі тэмамі могуць быць пытанні адносін у рамках Рады Еўропы, ААН, іншых міжнародных фарматаў, пагадненняў з удзелам Рэспублікі Беларусь і инш.

2. Анонсы падзей і мерапрыемстваў

Інфармацыйныя матэрыялы павінны тычыцца мерапрыемстваў ці іншых планавых відаў дзейнасці арганізацыі, якія ўтрымліваюць запрашэнне да ўдзелу альбо выніні якіх могуць прадстаўляць цікавасць для шырокага кола арганізацый грамадзянскай супольнасці.

3 . Навіны аб дзейнасці арганізацый

Інфармацыйны матэрыял павінен быць прысвечаны дзейнасці арганізацыі (падзеі, мерапрыемству, у якіх яна выступае арганізатарам альбо су-арганізатарам, праведзенаму даследаванню , кампаніі і інш.).

Матэрыял павінен змяшчаць канкрэтныя ўказанні на час і месца падзеі (даты правядзення мерапрыемства; горад, у якім праводзіцца кампанія; тэрміны правядзення даследавання і інш.), і кароткую змястоўную частку.

4. Навіны аб падзеях у рамках Беларускай Нацыянальнай платформы і праграмы Усходняе партнёрства.

Арганізацыі таксама могуць дасылаць для выстаўлення на сайце БНП арыгінальныя (аўтарскія) матэрыялы, апублікаваныя на іх сайтах, і якія тычацца працэсаў альбо падзей у рамках Беларускай Нацыянальнай платформы ці ў цэлым у праграме Усходняга партнёрства. Гэтыя матэрыялы публікуюцца на сайце БНП у выпадку, калі яны не дублююць ўжо прысутныя на сайце навіны ці ўтрымліваюць выражаную пазіцыю арганізацыі з нагоды бягучых працэсаў.

*Фармальныя крытэры, якім павінны адпавядаць матэрыялы , дасылаемыя для размяшчэння на сайце БНП:*

• Матэрыял павінен мець аўтарства альбо спасылку на сайт ці іншы інфармацыйны рэсурс арганізацыі, на якім ён апублікаваны ўпершыню.

• Мінімальны аб'ём матэрыялу - 200 словаў.

• Мова матэрыялу - беларуская ( прыярытэтна ), руская, англійская.

*Прынцыпы інфармацыйнага супрацоўніцтва*

Адказнасць за змест матэрыялаў, іх поўнасць і аб'ектыўнасць, нясе арганізацыя, якая дасылае матэрыял для публікацыі на сайце. Калі ў рэдакцыі сайта ўзнікаюць сумневы ў дакладнасці прыведзенай інфармацыі, рэдакцыя мае права звярнуцца да крыніцы інфармацыі за дадатковымі тлумачэннямі.

Вельмі вітаецца суправаджэнне беларускай ( рускай ) версіі дасылаемых матэрыялаў таксама ангельскім перакладам, такім чынам гэта істотна эканоміць час і рэсурсы, якія патрабуюцца для публікацыі матэрыялаў, а таксама пашырае аўдыторыю і разнастайнасць публікацый сайта БНП.

Рэдакцыя сайта гарантуе рэалістычную аператыўнасць выстаўлення матэрыялаў. Матэрыялы, што адпавядаюць апісаным вышэй крытэрам, публікуюцца максімум на працягу двух сутак з моманту атрымання (выключаючы выходныя і святочныя дні).

Захаванне аўтарскага права забяспечваецца абавязковым указаннем на арганізацыю-крыніцу матэрыялу і спасылкай на інфармацыйны рэсурс, на якім матэрыял быў упершыню апублікаваны.

Арганізацыі, якія ажыццяўляюць рэгулярнае інфармацыйнае ўзаемадзеянне з сайтам Беларускай Нацыянальнай платформы (дасылаюць не менш за 3 інфармацыйных матэрыяла ў месяц, якія адпавядаюць пазначаным вышэй крытэрам) атрымліваюць магчымасць змясціць свой лагатып на сайце БНП у якасці інфармацыйнага партнёра.